БЕЛАРУСЬ

ШТАДЗЕННАЯ ПОЛІТЫЧНА-ЭКОНАМІЧНАЯ І ЛІТЭРАТУРНАЯ ГАЗЭТА.

ГОД ВЫДАНЬНЯ I.

Падпіска на 1 м-ц: з перасыл. 15 р. без перас. 12 р.

АБВЕСТКІ: на 4-й страніцы прымаюцца ва усіх мовах па 2 мк. за радок пэтыту.

Газэта выходзіць штодня, апроч дзен пасьлясьвятонных.

Рэдакцыя і Кантора: Менск, Міцкевічава вул., Беларускі Дом (б. Юбілейны).

Рэдактар прымае ад 12—1 гадз. Кантора адчынена ад 9 да 2 гад. і ад 5 да 7 гад.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны.

Аплата прынятых рукапісау залежыць ад рэдакцыі.

Рукапісы назад не выдаюцца.

ЦАНА 1 МАРК.

№ 56 (83). Менск, Серада 31 сьнежня 1919 г. № 56 (83).

ПОЙДЗЕМ У ВЁСКІ.

У той час, калі у Мэнску адбываецца сякое-такое політычнае жыцьцё, калі там—далёка заграніцай, беларуская справа пастаўлена на досыць паважны грунт, калі з беларускім пытаньнем пачынаюць рахавацца на міжнародным прасторы і калі пытаньне аб незалежнасьці Беларусі пастаулено на парадак дзенны,—у той час нашае шматмільённае сялянство, т.-е., усё тое, што складае беларускі народ і завецца Беларусьсю,—нацыянальна сьпіць сном першых дзён дзяцінства.

За гэтые цяжкіе годы вайны і рэволюцыі народ наш нагледзеўся і наслухауся усяго; ён шмат падрос у політычным і грамадзянскім сэнсе, ён зразумеў ужо тые нездаровые адносіны паміж рознымі станамі грамадзянства, каторые панавалі на сьвеце дагэтуль, ён пакаштавау ужо плоду з дрэва пазнаньня дабра і зла, але астауся немкам, бяз мовы, без магчымасьці выславіць свайго найменьня, свайго ўласнага пачуцьця, свайго жаданьня, сваіх думак і замерау. А ужо з самой прыроды рэчы бывае так, што немата выклікае глухату і—наадварот. І народ наш глух, ён не пачувае свае асобнасьці, свайго нацыянальнага беларускага жыцьця і, як той сапрауды немка сярод чужых людзей, робіць усе, што яму пакажуць, каб не наразіцца на прыкрасьць. Само сабою разумеецца, што пры такім стане рэчы кожны можа сказаць, што беларускі рух ня мае карэньняу у народзе, што справа беларускага адраджэньня ёсьць выдумка паасобных людзей, з катораымі ня варта рахавацца.

Так яно ёсьць, так людзі гавораць і будуць гаварыць. Мала таго, яны будуць карыстаць з такога стану рэчы, будуць забіраць, дзяліць, прадаваць і прылучаць нашые землі разам з нашым народам, не зважаючы ні на якае права, ні на якіе протэсты, або лямэнты, з боку паасобных, хоц і правамоцных людзей. Гэта кожны ведае, кожны разумее, што прайшлі тые наіуные часы, калі ад голасу трубы раскідаліся іерыхонскіе муры.

Тым часам, шмат яшчэ знойдзецца людзей, каторые трубамі палохаюць ворага заміж таго, каб тварыць настаяшчую, рэальную сілу. Шмат ёсьць з паміж нас такіх дзеячоу, што у політыканцтве бачаць увесь сэнс свае працы заміж таго, каб іці на вёску, да сьпячага сялянства, работніцтва і будзіць яго ад атручваючага сну нацыянальнай несьвядомасьці. Пабудзіўшы народ да сьвядомага нацыянальнага і соцыяльнага жыцьця, стане лішнім, непатрэбным політыканство,—гэтая іерыхонская труба, і мы утворым рэальную сілу, каторая ва ўсе часы і ва ўсіх народау была ясьнейшая і паважнейшая за самае яснае паважнае права.

Трэба іці ў народ і ратаваць самых сябе, каб не назвалі нас людзі тымі ягамосьцямі, што таргуюць на кірмашы стаенных каней, ня маючы у кішэні меднага траяка. Трэба гукаць, трэба будзіць, трэба талкаваць народу, што ад нацыянальнага абуджэньня залежыць яго грамадзянскі і соцыяльны дабрабыт. Трэба засыпаць нашые сёлы, вёскі, гарады і мястэчкі адпаведнай літэратурай, трэба запоуніць іх нашымі агітатарамі, інструктарамі і настаунікамі.

Трэба-ж нарэсьце зразумець тую страшэнную багну, перад каторай мы апыніліся. Мы гаворым ад імя таго народу, каторага яшчэ няма, каторы ляжыць яшчэ у стане немай і глухой этнічнай масы. Мы выдаём сябе за прадстаунікоу таго народу, каторы нас не разумее, але каторы павінен зразумець, бо ён жыве і жыць будзе.

Цяжкая гэта работа—справа нацыянальнага усьведамленьня народу, пастаўленага у такіе нялюдзкіе варункі жыцьця, якіе злажыліся у нас на Беларусі. Апрача шматвяковага панаваньня ў нас двух варожых паміж сабою культур, мы маем яшчэ шмат горшае нашчасьце: гэта рэлігійны падзел нашага народу, каторы пагражае нам той магчымасьцю, што утварыла сэрбау і харватау, складаўшых у пачатку адзіны славянскі народ, але падзелены рэлігійным вызнаньнем:—праваслауным і р.-каталіцкім...

Трэба ведаць, што народ наш стрэне нас няпрыхільна і варожа і ня раз ён паб'е нас каменьнямі, асабліва у гэтые цяжкіе і няпэуные часы,—у часы зняве'ря і роспачы. Народ наш зразу нас ня прыме, як ня зразу ен прыняу тых, хто прыходзіу да яго, каб разрушыць маскоускае самадзяржавіе. І тут трэба быць цьвёрдым, і сьвята, аж да сьмерці, адданым тэй справе, каторая выведзе наш народ на дарогу да Беларускай дзяржаўнасьці. Тут, сапрауды, трэба мець тую мудрасьць зьмяіную і кротасьць галубіную, аб каторых мы чытаем у даунейшых сьвяшчэнных кнігах. Але хто пачувае сябе беларусам, хто сьвядома ставіцца да беларускай справы, той знойдзе ў сабе і цьвёрдасьць, і мудрасьць, і патрэбную кротасьць.

А перад усім, кожны беларус павінен памятаць, што *ен перш за усе беларус*, а потым ужо—яго партыйнае прыналежнасьць. „Шукайце перш царства нябеснага і праўды яго, а рэшта сама дадасца вам“.

Такімі думкамі павінна быць занята цяпер галава кожнага сьвядомага беларуса і з гэтымі думкамі ён павінен іці ў народ. А іці канечна трэба, бо усе мы стаім перад багнаю, каторая нямінуча ўцягне нас усіх разам з нашым політыканствам, калі не патрапім мы палажыць маста, каторы завецца—*нацыянальнае усьвядамленьне народу*.

Збавеньне і паратунак Беларусі—ў беларускім народзе, а соцыяльны дабрабыт нашага народу ляжыць у яго нацыянальнай сьвядомасьці, каторая выведзе нас да дзяржаунай незалежнасьці.

Соцыялізм і нацыянальнае пытаньне.

Ня можна таго сказаць, каб сярод тэорэтыкау соцыялізму ня было спроб, спрыяючых нацыянальнаму адраджэньню. Першым соцыялістам, каторы аддау гэтай справе усё сваё жыцьцё, быў вызначны украінскі вучоны і публіцыста М. Драгаманаў. Але яго ня лічаць за марксіста, на яго галаву сыпалося у працягу яго жыцьця многа нагаворау. Цікава зазначыць, што М. Драгаманау і украінскіе соцыялісты пашырылі прастор соцыялістычнай агітацыі. Ведома, што марксісты займаліся пропагандаю толькі сярод фабрычнага пролетарыяту, пакідаючы бяз увагі сялянскі пролетарыят і дробнейшае сялянство. Такое занядбаньне ва заходзе і ў цэнтры Эуропы шырокіх сялянскіх мас кінуло іх у абоймы клерыкалізму. Украінскіе соцыялісты усе свае стараньні зьвярнулі на арганізацыю шырокіх сялянскіх мас, каб прылучыць іх да соцыялістычнай ідэі і вырваць іх с-пад уплыву духавенства, каторае, як ведама, усё стаяло на службе эксплёататарау. Разумеецца, што украінскіе соцыялісты, каторые падтрымлівалі нітку драгаманаускай традыцыі, пашыраючы і паглыбляючы яго ідэі, мусілі, з натуры рэчы, зьвярнуць увагу ня толькі на эконамічны, але й на нацыянальны уціск збоку чужой нацыянальнай буржуазіі і фэодальнай арыстакратыі, і ім папанцавало зьвязаць соцыяльнае і нацыянальнае пытаньне у адну неразрывную цэласьць і стаць тым рэвалюцыйным тараном, які разьбівае троны й вішчыць дашчэнту імпэрыялізм.

Рэвалюцыя на Усходзе Эуропы, як бачым, умела прыцягнуць на сваю службу нацыянальнае пытаньне, і у тым ляжыць яе вялікая заслуга перад інтэрнацыяналам. Разумеецца, што праводыром нацыянальна-соцыяльнае рэволюцыі ва Усходзе Эуропы ня мог быць ніхто іншы, як украінскі і беларускі народ. Ня мог ім быць маскоускі народ, і вось з якіх прычын: маскоуская нацыя была на працязе вякоу сытая збоку нацыянальнага. Калі там паустала барацьба, то яе выклікалі толькі соцыяльные, а не нацыянальные прычыны. Маскоускі народ, маючы сваю дзяржаунасьць, паставіу сабе заданьне зьнішчыць *сваю* буржуазію, і *сваю* вялікую зямельную уласнасьць. Ані буржуазія, ані земляуласьнікі не абражалі нацыянальных пачуцьцяу маскоускай нацыі. Гэтые вышэйшые станы яе толькі ціснулі эконамічна. Іншая справа, украінская і беларуская нацыя. Іх рэвалюцыйнае заданьне было далёка цяжэйшае. Ім трэба было пабораць буржуазію і веліказямельнае панство, каторые эксплёатавалі яе ня толькі эконамічна але так сама й культурна нацыянальна. Калі-б соцыялістычная думка, асабліва марксізм, узялі былі пад увагу, побач эконаміцкага, так сама і нацыянальна-псіхолёгічны мамэнт, то само сабою разумеецца, заданьні недзяржауных народау былі-б лягчэйшые. Але неразуменьне рэвалюцыйнай сілы нацыянальнага пачуваньня было перашкодаю эконамічнага вызваленьня. Проці нацыянальнага вызваленьня паўстала ня толькі буржуазія. Памылкова бачучы у нацыянальным руху элемэнт рэакцыі, або уважаючы нацыянальнае вызваленьне справаю мала важнаю, або такою, што не даецца укласьціся ў рамкі навуковага марксізму, соцыялістычны інтэрнацыянал глядзеу скрыва на нацыянальны рух і *больш спачувау маскоускім інтэрнацыянальным ортодоксам*. Гэтае спачуваньне, „верным“ маскоускім марксістам, такім як Алексінскі, Бурцаў, Плеханаў, Чарноў, Русанаў і іншые, каторые паказаліся потым нічым іншым, як *соцыял імпэрыялістамі* (слова „соцыял-патрыот“ ня лічым абразьлівым, калі соцыяліст жадае дабра свайму пролетарыяту бяз шкоды пролетарыяту другой нацыі),—давала ім толькі маральнае падтрыманьне і быццам апраўдвалі тые нападкі і кпіны, якіе сыпаліся і сыплюцца на голаў нацыянальнага руху.

Злучэньне нацыянальнага і соцыяльнага мамэнту у нацыянальным руху толькі падвышала рэвалюцыйнасьць пролетарыяту на Усходзе Эўропы. Украіна, каторая першая зразумела, што без нацыянальнага вызваленьня немагчыма вызваленьне соцыяльнае, прыдбала сабе вялікую прыцягаючую сілу. Украінскі народ, адтрымаушы змогу выказаць сваю волю, не абмяжавауся толькі словамі, голымі заявамі, што ён прызнае права народау на нацыянальнае самаазначэньне, але пачау рабіць гэта на практыцы. Адчуваючы доугіе вякі цяжар нацыянальнага уціску, украінскі народ, як *нацыянальна галодны*, зразумеу вагу нацыянальнага пачуцьця і, побач з соцыяльным вызваленьнем, паставіу так-жа ня меньшае заданьне нацыянальнага вызваленьня недзяржаўных народау. Далей, украінскі, а так сама і беларускі, народ, на працязе вякоу спролетарызованы і вызыскованы чужою і здэнацыяналізованаю буржуазіяю і фэадаламі, першы зразумеу, што нацыянальны уціск перш за усё адчувае толькі пролетарыят—зямельны у першую чаргу,—бо буржуазія „для панства лукавага, для лакомства нямчаснага“ вельмі скора годзіцца з чужым панаваньнем, як толькі гэтае панаваньне забясьпечыць яе матэрыяльные карысьці. Жадаючы для сябе права на культурна нацыянальны разьвітак і політычную незалежнасьць, украінская і беларуская нацыя не адмауляе права на самаазначэньне ня толькі народам, што жывуць за межамі свае тэрыторыі, але і тым, *што жывуць на іх зямлі*. Закон пра нацыянальна-пэрсональную аўтаномію зьяуляецца першаю спробаю ухіленьня нацыянальнай несправядлівасьці.

А. Хомік.

АПОШНІЕ НАВІНЫ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ПОЛЬСКАГА ГЭНЭРАЛЬНАГА ШТАБУ.

Ад 27—XII.

Літоуска-Беларускі фронт.

У змаганьнях разьведчых патрулёу над Дзьвінай мы ўзялі некалькі—дзесят палонных, бальшавіцкі напад пад Дзіснай адбіты.

Вэлынскі фронт.

Ажыўленая разьведчая чыннасьць на усход ад Палонна.

Умовы між Нямеччынай і савецкай Расіяй.

ВЕНА, 28—XII. Агэнтура Гавасу паведамляе з Архангельску, што бальшавікі утварылі умовы з Нямеччынай, подлуг якіх абяцаюць вайсковую дапамогу і запэуняюць, што ня будуць весьці ў Нямеччыне бальшавіцкай пропаганды.

Рэволюцыя і эволюцыя.

Адносіны у грамадзянстве паміж клясамі і прыватнымі асобамі не застаюцца пастаяннымі, а вечна мяняюцца на карысьць больш пакрыуджаных. Гэтая перамена можа прайсьці адразу, гвалтоуна, усе як бы пераварачваецца дагары нагамі. Кляс прыгнецены ставовіцца панующым і наадварот. У такім разе мы маем рэволюцыю. Але-ж гэтые адносіны могуць мяняцца ступнева, па водлуг таго, як ступнева мяняюцца разуменьні (паняцьці) у мазгох людзей. Адносіны паміж людзьмі ступнева, памаленьку, але пастаянна паляпшаюцца, і чалавецтво крок за крокам, але верна ідзе к прогрэсу. Тут мы маема эволюцыю грамадзянства. Рэволюцыю можна параунаць з землятрасеньнем, калі цэлые месты разваліваюцца і душаць пад сабою нявінных людзей, ці з гураганам, каторы ломіць усе на сваей дарозе, і доуга потым людзі мучацца, пакуль направяць тую шкоду, якую ен зрабіу. Эволюцыю-ж можна параунаць з чатырма порамі году, калі усе у прыродзе разгортваецца ступнева, так што мы ня можам паказаць граніц паміж асобымі порамі, хаця-ж гэтые поры наогул і вельмі рожняцца адна ад другой. Няпрыменна прырода прыходзіць ад зімы, да вясны, ад вясны да лета, ад лета да восені і ад восені да зімы. І скуткам гэтага зьяуляецца ня нішчэньне дабра тысячы людзей, а новы багаты урадж?й, нясучы благаславенство і шчасьце людзям.

Самая вялікая перамена у адносінах людзей, якая адбылася і яшчэ адбываецца, дзякуючы хрысьцянству, прайшла эволюцыйнаю дорогаю. Хрысьціяне нічога ня нішчылі, незабівалі дужых гэтага сьвету, ня вучылі таму, што адзін кляс павінен душыць другі, а пашыралі ідэю міласьці да бліжняго. Гэтая ідэя ступнева уходзіла у сьвядомасьць людзей і вынікам зьявілася тое, што сьцерлася у сьвядомасьці людзей розьніца паміж рабом і панам, бо прад Богам яны роуны, і навет раб можа быць лепшым за пана. Прауда, пралілося шмат крыві, але крыві хрысьціянскай. Не хрысьціяне нападалі на язычнікау, а наадварот, язычнікі хацелі іх зусім вынішчыць. Але ідэі нішто не магло задушыць.

Другая эволюцыя прайшла у эпоху адраджэньня, дзякуючы азнаямленьню эуропэйскага адукованага грамадзянства з вялікімі твора і грэцкіх фільозофау, матэматыкау і другіх вучоных.

Гэтая эпоха прінесла свабоду сумленьня, бо хрысьціянство было ортодаксально і думало, што абок яго някай іншай прауды ня можа быць. Ідэя так сама пабядзіла, хаця-ж насіцелі яе ні на кога не нападалі, нікога не забівалі, а наадварот, іх самых часта трымалі па турмах і палілі на кастрох.

Першая рэволюцыя у Эуропе зрабілася у Англіі у XVII веку, калі Кромвель захапіу уладу у свае рукі і катавау караля. Векам пазьней, у XVIII веку блізка тое самае адбылося у Францыі. Тут кляс буржуазіі выхапіу уладу з рук арыстакратыі. Пралілося мора крыві, і гэтую кроу пралівалі самі насіцелі новых ідэй. Яшчэ векам пазьней, у XIX веку адбылася рэволюцыя, і самая бяскроуная, у Нямеччыне. Нямецкую рэволюцыю па яе бяскроунасьці можна было-б навет не называць рэволюцыяй, а назваць эволюцыяй. І напастатку прайшла рэволюцыя у самым адсталым эурапейскім краі, у Расіі.

Гэта самая крывавая рэволюцыя, бо тут улада перайшла ня у рукі асьвечанай буржуазіі, а цемнага пролетарыяту, выставіушага лёзунг свае дыктатуры.

Рускі пролетарыят думае, што „гэта будзе астатні і рашучы бой, з інтэрнацыяналам здабудзем мы спакой“.

Мы ня думаем, што гэта так будзе. Хрысьціянство прышло з высокімі ідэямі роунасьці людзей. Аднак самые насіцелі гэтае ідэі, стаушы у улады, зрабіліся душыцелямі другіх. Духавенство праз інквізыцыю баролся са усякаю вольнаю праявою думак, і аутарытэтам хрысьціянскага вучэньня апраудывало прыгняценьне аднаго клясу другім. І патрэбна была рэволюцыя астатніх чатырох вякоу у Эуропе.

Бальшавізм прышоу з лёзунгам дыктатуры пролетарыяту, аднак фактычна гэтую дыктатуру трымае у сваіх руках прывілегірованая партыя „коммуністау“, каторая ужо і цяпер зьяуляецца, можна сказаць, „арыстакратыяй“ у пролетарскай масе. Гэтая „арыстакратыя“ стараецца выкарыстаць уладу у сваіх мэтах, у мэтах нажывы і прыстройваньня сяброу свае партыі. Такім чынам патрэбна новая рэволюцыя у імя іх жа ідэй, каб дыктатура належала не аднай партыі, а усяму пролетарыяту, каб абваліць комуністау.

Разглядаючы палажэньне пролетарыяту, мы бачым, што яно найлепей стаіць у найменей рэволюцыйным краі Эуропы, у Нямеччыне. Нямецкі рабочы да вайны быу лепей забясьпечаны, ніж рабочые рэспубліканскай Францыі.

У самым жа няшчасным становішчы знаходзіцца рабочы Расіі, дзе улада ні-бы то знайходзіцца у руках гэтага ж рабочага. Тут рабочы ледзьве можа зарабіць на фунт хлеба у дзень.

Рэволюцыя немагчыма у Англіі, дзе дзяржауны строй такі элястычны і дзе парлямэнт прыслухоуваецца да патрэб рабочага і адразу гэтые патрэбы задавальняе, не даводзячы да вялікай трасяніны.

Рэволюцыя настолькі патрэбна, наскольки на дарозе разьвіцьця народу стаяць перашкоды, замінаючые эволюцыйнаму яго разьвіцьцю. Раз гэтых перашкод няма, і край можа эволюцыйнаісьці да лепшай будучыны, то рэволюцыя ня мае жаднага сэнсу на свае істнаньне, і фактычна яна ня можа зрабіцца, бо есьць дарогі, на якіх жаданьня народу могуць быць задаволены.

У жыцьці грамадзянства, як организму, рэволюцыю можна параунаць з опэрацыяю, каторую трэба выпауніць, калі ужо няма аніякіх способау ратаваць жыцьце организму.

А. Д.

Політычные весткі.

Усходняя Галіччына мае быць аддадзена Польшчы.

„Тан“ паведамляе, што на адным з апошніх пасяджэньняу вышэйшай рады закранута было пытаньне аб усходняй Галіччыне. Есьць тэндэнцыі, каб прыслухоувацца да вымаганьняу Польшчы і перадаць ей гэты край назаусёды.

22 га сьнежня Клемансо зьвярнууся да польскай мірнай дэлегацыі у Парыжы з лістом, у каторым ен афіцыяльна паведамляе, што вышэйшая рада з усімі злучанымі і саюзнымі дзяржавамі хоча затрымаць пастанову аб тым, каб даць Польшчы мандат на усходнюю Галіччыну з умовай, каб гэтую справу разгледзіць нанова.

Перад вайной паміж Мэксыкай, Японіяй і Амэрыкай.

У Амэрыцы зноу пасьпешным чынам рыхтуюцца вайсковые падгатоукі. Фабрыкі амуніцыі адтрымалі вялікіе заказы. У вайсковым дэпартамэнце ідзець інтэнсыуная праца. Як кажуць, апошнімі часамі выйшлі непаразуменьні паміж Злучанымі Штатамі з Мэксыкай і мажліва, што будзе вайна.

У політычных сфэрах выказываюць погляд, што у неможлівых адносінах Мэксыкі віновата Японія, каторая сакрэтна інтрыгуе проці Злучаных Штатау і хоча провацыраваць вайну, каб яна магла далучыцца да вайны і аслабіць сваю найвялікшую конкурэнтку—Амэрыку.

Аб дапамоге сярэдняй Эуропе.

Льорд Курзон у парлямэнце вытлумачыу, што да будучага жніва трэба было выдаць 140 мільен долярау на вуглі і прадукты, как абмінуць крызыс у цэнтральнай Эуропе. Гэтага зрабіць адна Англія ня можа. Патрэбна і дапамога Злучаных Штатау.

Выбары прэзыдэнта у Францыі.

Карэсп.—бюро з Парыжу паведамляе, што нібы Клемансо мае быць выбраным за прэзыдэнта Рэспублікі, хаця бы з большасьцью 75-ці галасоу. Мільеран зробіцца тады прамьерам міністрау, а Пуанкарэ—калі ен згодзіцца—міністрам фінансау.

Флот коаліцыі у Уладавастоку.

Кар. бюро паведамляе з Масквы, што у Уладывастоцкім порце стаяць ваенные параходы коаліцыі. За парадкам у горадзе глядзяць чэскіе салдаты. Але чэхі вымагаюць, каб іх адаслалі да хаты, кажучы, што калі іх вымаганьні ня будуць выпаунены, дык яны самі сабе дадуць раду.

Новы бальшавіцкі згавор у Вэнгрыі.

Вэнгэрскае карэсп.-бюро паведамляе, што вайсковая улада 10 дзен таму назад натрапіла на сьлед згавору, каторы меу сваей мэтай зрабіць комуністычны пераварот. Комуністы мелі сваім плянам узарваць у паветро галоуную каманду нацыянальнай арміі і так сама залю рады міністрау у часе пленарнага пасяджэньня.

М. Канапніцкая.

КРЫСТА.

(Гл. № 51).

Зложаные рукі прыціскала да грудзей, голас быу гарачы, погляд змучаны, благальны, стралісты. Ішла гэтак некі час, вачыма прабіваючы нябесы, а спатыкаючыся па пяску, калі дарога яе раптам паніжала.

Крыста падыходзіла да вескі. Здалеку ужо чуваць было людзкі гоман і рык скацiны. Людзі вярталіся з кірмашу, з Бярэзьніцы. Кучкамі ішлі, пакрыківаючы на волікау, на кароу і гутарачы паміж сабой.

Здалеку, з таго месца, дзе была Крыста, усе гэта зьлівалося у адвастайны, зьмешаны з грукам колау і гаганьнем гусей, гоман, сярод якога выбухалі, як фэйерверкі, пьяные выкрыкі, прыпеукі, ляскаiньне з пугі і парыківаньне бугая.

Думкі Крысты раптоуна зьвярнуліся у гэты бок.

... Людзі з кірмашу ідуць. дык і маці ідзе... або і ужо прышла... І Павал...

Імя гэтае адбілося у яе думках нейкім дзіуным рэхам. Задумалася над ім, як бы яго чула першы раз.

— Павал...

І раптоуна цемная чырвень абліла яе твар, лоб, шыю. Крыста пачула стыд сама перад сабой. У гэтай шырокай польнай пустцы пачула стыд гарачы, дзявочы і спусьціла вочы.

Ішла гэтак некалькі часу у вялікім, з дна сэрца даходзячым, водблеску, які тухнуу паволі. Гоман галасоу прыбліжауся ваупроці, быу што-раз бліжэйшы, што-раз выразьнейшы.

Азірнулася Крыста у бок і з дарогі зышла.

... Праз агароды пойдзе, не праз веску... Пад Масты пойдзе... Дарогай ля крыжу пойдзе... Пойдзе далека, ажно пакуль Антося спаткае... Калі б і да самых Мастоу прышлося ісьці, пойдзе! Здалеку яго убача, здалеку! Ен яе гэтак сама зараз убача... Здалеку яе пазнае... Сокалам да яе паляціць... Віхрам да яе паляціць... А яна да яго... да яго...

— Няхай сабе што хоча, будзе! Няхай што хоча дзеецца! Няхай ен хоць адну добрую гадзінку мае! Няхай-жа ен хаця раз, хаця адзін разочак добрым сэрцам прытуліць яе да сябе! Хай-жа ен хаця столькі, як праз адну малітву, рады й шчасьлівы будзе, што да хаты вярнууся!

Гаварыла цяпер голасам салодкім, прыцішаным, пранятым. Гвалт пачуцьцяу у ей сьціх, апау; вялікі, ціхі жаль залівау яе сэрцо, яе душу.

— Няхай жа, ен, бедачына, хоць крышку радасьці мае! Хай-жа яму вернецца вернасьць і каханьне! Хай яшчэ яму гэты сьвет кветкаю запахне!

Гаварыла і думала аб ім, як гаворыцца і думаецца аб паміраючым, які ужо заутра сонца ня убача. Абы сеньня... Абы хвіліну яшчэ!

Аб тым, што з ею станецца, што з ею будзе, неяк ня думала. Увесь яе страх, яе трывога, бытцам расталіліся у адным жаданьні:

— ... Хаця раз! Хаця адзін разочак!

Была цяпер на грэблі, за якой чарнеуся крыж у паветры імглістым. Прыглядзілася пільна і здалося ей, што з-пад крыжа падымаецца чалавек. Ня бачыла яго, але ей здалося.

Жар бухнуу на яе, сэрцо у ей закалацілося, разьбілося бытцам...

— Антось! Антось!—крыкнула моцным голасам і, выцягнуушы перад сабою рукі, кінулася праз грэблю бегчы, бытцам яе вецер панес.

Вялізарны гвалт болю і любасьці зазьвінеу у гэтым крыку. Тоустая хустка асунулася ей з галавы на плечы, хвартух павявауся за ею у сіняй імгле, бытцам вялікіе скрыдлы, а яна, як асьлепленая птушка, ляцела у гэтую сінясьць і імглу, з адкіненай назад галавой, крычучы, плачучы, у сьлезах і агні уся.

Пазнау Антось яе здалеку.

— Крыста! крыкнуу—Крыста!

Але пакуль апамятауся, ужо на грудзях яго ляжала, ужо яго шыю рукамі абнімала, ужо свой твар цьмяны з плачам да яго прытуляла.

— Антоська! Антоська! Далібог Антоська!

У крыку зьліліся іх вусны і гэтак стаялі—нямые.

Малады жаунер першы ачнууся з гэтага апьяненьня. Узяу аберуч яе цемную, паднятую да сябе голаву, адхінуу крыху і глядзеу. Глядзеу доуга, скваппа, пільна.

— Чаму ж ты гэтак зблажэла, Крыста? Чаго ж так зьмізарнела?

Загарэлася раптоуным румянцам, сыплючы іскрамі сьлез з пад апушчаных павекау.

— Без цябе так, Антоська, без цябе!

— Дык табе маркотна было без мяне?

— Ой маркотна, Антоська, маркотна так... як без тае вадзіцы! Як без таго хлеба!

— Дык рада ты, што я вярнууся?

— Ой рада, Антоська, рада! Бытцам мне душа уласная вярнулася. Гэтак рада!

— У хаце усе добра?

— Усе, Антоська, усе!

Стаяла, прытуліушыся да яго, ня пушчаючы рукамі яго шыі, а і ен ня пушчау яе галавы і глядзеу у твар, з якога біу жар мукі і шчасьця разам.

Маучау хвіліну, пасьля к ей пахінууся, глыбока у вочы зазірнуу; спытау сьціха:

— А была ты мне верна Крыста?

Задрыжалі яе павекі.

— Ой, была, была, Антоська!

— Так табе, Пане Божа, дапамажы?

— Так мне Пане Божа...

Голас яе сарвауся і бухнула плачам.

— Дык чаго-ж ты плачаш, калі гэтак?

— З радасьці плачу, Антоська! З радасьці і з каханьня плачу!

Тагды ен голау яе пусьціу, з галавы шапку зьняу і на крыж ясны погляд зьвярнуу:

— Дзякую-ж Табе, Пане Езу Хрысту, што ты мне з гэтай дарогі шчасьліва да хаты вярнуцца дазволіу, а усе добра у сваей міласэрнай апецы захавау! У імя Ойца, і Сына, і Духа Сьвятога. Амэн!

Пераэжагнауся шырокім крыжам, паволі руку з плячука на плячук пераносячы, а пасьля міла на Крысту глянуушы, да сябе яе прытуліу.

— Ну, ужо ня плач, ня плач, Крыся! Мая-ж ты! Мая? Мая?

— Твая, Антоська, твая!

Дрыжала пад уражаньнем Антосевай малітвы, зубы яе сьціха ляскалі.

— А няхай сабе!—думала.—Хай там будзе. што хоча! Хай сабе у пекле згару па век векау!

— Чуму-ж гэтак калоцішся, нябога?

— Зімна...

Утуліла голау у плечы і прыплюшчыла павекі.

— Хадзем жа хутчэй да хаты, дык там пагрэешся!

Кранууся ісьці, ня пушчаючы яе шыі.

Цяпер толькі прыкмеціла, што Антось крыху кульгае. Але нічога не сказала. Вочы яе гэта бачылі, але не данесьлі да душы, на якой ляжала вялікая цемень, нейкая чарната? І толькі бачучы, што Антось да дарогі абарачываецца, прачнулася раптам.

— Праз грэблю пойдзем, Антоська, не праз веску! Бліжэй будзе...

А ен сьмяяуся.

— Ой, ты, ты!.. Хіба-ж ты ведаеш, што блізка, а што далека! У мяне аб гэтым пытайся, у мяне! Дык я-ж на гэткім канцы сьвету быу, што за морам яшчэ... Дык я ужо і пісаць мала пісау, бо гдзе-ж там папера магла дайсці, калі я ледзь дайшоу...

— Ой, выглядала я твайго пісаньня, выглядала,

У Польшчы.

Бальшавікі прапануюць мір Польшчы.

Львоуская „Газэта Поранна“ піша, што урад савецкай Расіі зьвярнуу ся да польскага ураду з мірнай пропазыцыяй. „Пш. Веч.“ адкідае гэтые весткі.

Польшча вымагае выдачы нямецкіх начальнікау.

З Парыжу паведамляюць, што Рада пяці адтрымала ад польскай улады пропазыцыю аб в дачы усіх нямецкіх афіцэрау і начальнікау, якіе у час окупацыі у Польшчы зрабілі розные праступы проці інтэрнацыянальных правоу.

У Прыбалтыцы.

Літва, Латвія і Нямеччына.

„Тэлеграф Унiён“ паведамляе з Тыльзыту, што у пачатку мінулага тыдню прыбыла да Кенігсбэргу латыская часьць з мэтай заняць горад. З няясных прычын гэтае-ж самае войско пазьней адтрымало загад вярнуцца.

Так-сама перадаюць, што каля Лейгшаргу концэнтруюцца моцные літоускіе і латыскіе вайсковые часьці, каб заняць зараз жа, пасьля ратыфікацыі мірнага трактату, тэрыторыі, якіе будуць прызнаны за Літвою.

К мірным перагаворам.

Перагаворы у Дорпаце.

Мірная конфэрэнцыя у Дорпаце зноу пачала перагаворы аб устанауленьні межау паміж Эстоніяй і Расіяй. У гэтым кірунку савецкі урад зрабіу вялікіе уступкі, за гэта вымагаючы гарантыі, каб з боку эстонскай тэрыторыі ня былі зроблены ніякіе крокі жадных армііу проці савецкай Расіі.

Зьмены у адносінах да савецкай Расіі.

Тэлегр. Камп. паведамляе з Прагі, што чэскі міністар заграничных спрау, д-р Бэнэш, гэтымі днямі меу гутарку з прадстаунікамі друку аб політычным становішчы, якое ен знайшоу у час свайго прабываньня у Парыжы і Льондане. Аб становішчы у Расіі міністар вос што казау:

У самым паважным эуропэйскім пытаньні, г. з. у пытаньні аб Расіі адбыліся зьмены у адносінах коаліцыі; глауным чыном у адносінах Францыі і Англіі. Эконамічные залежнасьці прымушаюць Эуропу не адмовіцца і надалей ад расійскіх сырых матэр'ялау, і дзеля гэтага, пасьля доугіх перагаворау, ухвалено прызнаць цяперашнюю уладу Расіі, давясьці да міру паміж расійскімі партыямі пры пераконаньні, што бальшавікі пойдуць на уступкі і троху паправяцца. Дальнейшы льос расійскай політыкі пяройдзе у рукі расійскай дзяржавы. Наогул, політычные пытаньні адсунуты на другі плян, а на першым пляне стаяць цяпер пытаньні эконамічные.

Дэнікініяда.

Ліст Гіндэнбурга Дэнікіну.

Украінскае прэс. бюро публікуе ліст Гіндэнбурга Дэнікіну:

„200 год таму назад знамяніты чалавэк у Расіі, Патро Вялікі, прадасьцярог сваіх прыхільнікау ад вайны з Нямеччынай, паказываючы на тое, што гэткая вайна можа прывясьці Расію да зруйнаваньня. 50 год таму назад найвялікшы чалавек у нямеччыне, Бісмарк, прадасьцярог цара Вільгэльма ад вайны з Расіяй, бо такая вайны прывяла-бы нямеччыну да развалу. Цяпер збыліся гэтые абодвы прароцтвы. Абедзьве дзяржавы заваяваны і пераживаюць няшчасьці. Абедзьве дзяржавы, апрача гэографічных злучнасьцяу, маюць так сама розные супольные інтарэсы. Дзеля гэтага абедзьве павінныісьці рука у руку, каб зноу адтрымаць ранейшую моц“.

Літэратура і жыцьце.

„Цені“-новая драма, напісаная Ф. Аляхновічам.

„Цені“ былі пастаулены 26 сьнежня на сцэне гарадзкога тэатру. Зьмест драмы такі (рэч дзеецца у месьце). Музыкант Сьцяпан ігрою на скрыпцы утрымлівае сваю сямью,—жонку Марыю і 18-летняга гарбатага сына Міхася. Сьцяпан ня знае духоунага супакою: жыцьце не пазволіло разьвіцца яго музыкальнаму таленту; мастацтво стало у яго руках рамяслом. У доме Сьцяпана селіцца кватарантка, Матыльда. Матыльда, маладая інтэлігэнтная дзяучына, вельмі падобная да сваей маткі Ганны, каторую колісь любіу Сьцяпан. Гэная любоу была для Сьцяпана вельмі няудалай: Ганна кінула яго. Цяпер пачынае Сьцяпан любіць Матыльду, мо, толькі дзеле таго, што яна падобная да Ганны. Сын, Міхась, гэтак сама палюбіу Матыльду. Жонка, Марыя, ня можа перанесьці гэтага, і канчае самагубствам. Матыльда, даведаушыся, што яна зьяуляецца якбы конкурэнткай нябошчыцы маткі, Ганны, пакідае дом Сьцяпана. Варочаецца з вескі ад свайго сябра Міхась і, бачучы мертвую матку і не знаходзячы у доме Матыльды, у роспачы так сама канчае самагубствам. Астаецца адзін Сьцяпан. Ен прабуе гэтак сама налажыць на сябе рукі, але не хапае у яго адвагі.

Прыгавор аб вартасьці гэтага твору можа даць толькі поуны крытычны разбор яго. А гэгакі разбор будзе магчымы толькі тады, як ен вы друкуецца, калі крытык будзе мець гэты твор у руках, каб уважна прасочыць за думкаю аутара і за літэратурным і драматычным характарам твору. Мала бачыць твор на сцэне—трэба яго уважна прачытаць, бо часта бывае, што артысты сваею ігрою даюць ня тое, што дау аутар, бывае, што бачыш на сцэне тыпы, якіх ня знойдзеш у творы і—наадварот. Дзеля гэтага пастараюся зрабіць толькі короткі крытычны нарыс, грунтам якога будзе толькі тое, што чуу і бачыу на сцэне.

Па свайму зьместу „Цені“ зьяуляюцца адвечным сумным енкам набалелай чалавечай душы аб тым, як жыцьце забівае у чалавеку яго духоуные парывы, яго талент; аб тым, як цяжкіе варункі жыцьця ломяць сілу духа і волі у людзях багата абдараных прыродаю, у людзях таленту; аб тым, як будзеншчына робіць з уталянтованых людзей калек, нязольных ані да духоунай творчасьці, ані да нормальнага чалавечага жыцьця; аб тым, як гэтые выбітые з каляіны таленты атручваюць увакруг сябе людзкое жыцьце.

Сьцяпан і прадстауляе сабою талент, зломаны будзеншчынай жыцьця. Сьцяпан—мастак. Гармонія музыкальных тонау напауняла і напауняе яго душу. Але у маладасьці, у вясну жыцьця Сьцяпана, гэта гармонія была поунай ч роуных тонау,—тонау так моцных, што, здавалося, яны здолеюць прабіць шэрасьць жыцьця і падняцца у сьветлае паднябесьсе, у краіну панаваньня духа, каб адтуль спускацца пяруном, прабіваць заслону, якая агарнула чалавечы дух, і падымаць гэты дух угору, адкрываць перад ім новые прасторы, прасторы чыстага і вольнага царства. З льозунгам „мастацтво для мастацтва“ увайшоу у жыцьце Сьцяпан. Прайшло лето, і настала восень у жыцьці Сьцяпана. Душа яго ізноу поуна музыкальных тонау. Але якіе гэта тоны, Тоны трыумфу? — Не, гэга тоны горкага жалю па страчаных сілах, гэта тоны поуные чорнай роспачы—безнадейнасьці. Няудалая любоу надламала яго духоуные сілы; цяжкае жыцьце змусіло яго зламаць льозунг „мастацтво для мастацтва“. З мастака стау ен шарманшчыкам, як сам сябе называе: і ен і шарманшчык іграюць толькі дзеле таго, каб пасьля выцягіваць руку, просячы платы. Прауда, любоу Матыльды нібы сонцо асьвячае сівые валасы Сьцяпана, але і зьнікае яна хутка, як зорка, астауляючы за сабою у душы Сьцяпана новы боль, новую роспач,

Чым мог быць. і чым стау Сьцяпан—вось дзе увесь трагізм твору „Цені“.

Тып Сьцяпана абрысованы з праудзівым мастацтвам: поуна, выразна і прыгожа.

Міхась—гэта патрэт бацькі. Як і у бацькі, душа Міхася мастацкая: ен поэт. Бацьку зламала скалечанае жыцьце і любоу, яго—горб і любоу. Розьніца мо' у тым, што бацька меу сваю вясну, поуную шчасьця, надзеі і веры, бо жыцьце палажыло на яго путы пазьней, а сын ня ведау такой вясны: нарадзіуся з гарбом.

Цяпер аб жонцы Сьцяпана. Можна ня быць самому талентам, аднак разумець таленты. Марыя, звычайная кабета, але яна разумее Сьцяпана; апрача таго, яна любіць Сьцяпана. І у той час, калі Сьцяпан вісіць паміж небам і зямлею, паміж мастаком і шарманшчыкам, і увесь час шукае некага шчасьця, яна прыкладае усе сілы, каб утварыць хатні супакой, дзе-б Сьцяпан мог знайсьці духоуную раунавагу. І калі Сьцяпан насьмешліва пытае: Ці было у гэтым доме калі шчасьце?—яна адказвае: „Але, быу супакой“. Гэтые словы характарызуюць Марыю. Разьбітые таленты затруваюць увакруг сябе атмосфэру, і Марыя цярпіць, але любоу яе да Сьцяпана дае ей сілу зносіць гэты цяжар. Яна разумее, што Сьцяпан яе ня так любіць, як трэба, што сэрцо яе таксама

як гэты конюх дажджу выглядае! Ой, чаму ты, чаму хоць гэтага не напісау, што жывы...

— Напісау! Далібог напісау! „Заказны“ ліст пaслау! А як-жа! Гэта-ж яны толькі цяпер гэты ліст у Арцелі аддалі, што ня мог ен трапіць. Хадзіло гэтае пісьмо больш чатырох месяцау па сьвеце. Кажуць у Арцелі: — Кепска напісана!—Чаму кепска напісана?..—кажу.—Гэта-ж выразна стаіць: „Да Крысты Жауверкі.“ Кажуць: Мала! Ды як-жа гэта ня мала на гэтулькі дарогі? А гэта-ж я захрамау, ідучы да цябе!

— О, Езу, Езу! І надта баліць?

Э-э... так, ня надта! Ня надта! У дарозе, дык мне надта балела! Але цяпер ня надта! Цяпер бы я і да Касьцельніцы дайшоу!

Ішлі паволі, прытуліушся да сябе.

Ен падымау голау высока, ясным поглядам па палех пазірау, цалавау яе, гладзіу па галаве, гаварыу, распытвау. Адразу хацеу ей усе расказаць, адразу хацеу аб усім даведацца. Гэтак шмат шчасьця у грудзях пачувау, што хвілямі перарывау мову і сьмяяуся голасна да гэтага шэрага неба, што іх абвімало ранным змрокам, да гэтага пустога папару, да жыцьця.

Крыста ішла, прыгнутая крыху яго рукой, з пахіленнай галавой. Пазірала яна кругом няпрытомным поглядам, як той, хто ідзе у пропасьць. Ледзь-няледзь, крыху толькі, чула з таго, што гаварыу Антось. Ішла задумаушыся, у нейкай вялікай парадзе з уласнай душой; вузкіе ея бровы падняліся высока на ілбе, перарэзаным тоустай, падвужной маршчынай.

Гэтак увайшлі на грэблю.

— Гэтак я рады, Крыся—адазвауся Антось—гэтак я рады, бытцам мне хто на руку сто рублеу налічыу! Гдзе! Больш! Каб мне хто сто і дваццать налічыу, дык-бы я яшчэ гэткі рады ня быу, як з таго, што да цябе вярнууся. Страшэнна занудзіуся! Гэтак я занудзіуся, Крыся, што а-ей! Што кажаш?

Не гаварыла нічога. Можа вусны яе зашапталі самі якое слово роспачы, але яна аб гэтым ня ведала.

— Ды не глядзі—ж ты на зямлю, а на мяне глядзі! Гэта-ж я твае вочы усе перад сабой бачыу, аж там ажно за морам! Дык гэта табе Валенты сказау, штоіду

Падняла голау.

— Але...

— Калі-ж ен да вас прышоу?

— На дарозе я яго стрэла...

— Куды-ж ты ішла?

Агонь бухнуу на яе.

— Так сабе ішла...

Прыпомніла сабе, праудзівей, пачула, што яшчэ дагэтуль сьціскае у руцэ грошы, якіе за яго душу несла і мімавольна, наадварот, як-бы з прымусу нейкага, сказала:

— Задушкі сеньня...

Уздыхнуу на гэта жаунер.

— Вечны адпачынак дай ім, Пане, а сьветласьць векавечная хай ім сьвеціць...

— Амэн!—дакончыла Крыста ціхімі, голасам.

Але ен ужо голау падняу, разсьмяяуся, і, глянуушы праз грэблю на веску, сказау:

— Вось як з комінау дым верне! Ці гэта бабы хлеб пякуць, ці што? Бачыш Крыся? Як жа?

І не чакаючы адказу, гаварыу далей.

— А вітай-жа, прывітай ты, дымочку сівы! Ды мочку ялоупвы! Гэй! Гэй! А я ужо думау, што ніяк не дабьюся да хаты... да цябе! А дзякуй-жа Табе, Божа! Хадзем-жа хутчэй, Крыся! Маці ведае?

Ажно дрыжау з нецярплівасьці, шчасьце сьвяцілося яму з пахудзеушага і ветрам спаленага твару.

Дык ня могучы стрымацца і не чакаючы адказу Крысты, схапіу яе у-поу і цалавау яе вусны, яе вочы.

— Гэй, Крыся! Крыся! Гэта-ж мы зноу разам!

— Разам, Антоська, разам!

— Вось ты ужо рада, кабецін!

— Ой, рада, ледзь мне сэрцо на дзьве часьці не разарвецца...

Прыціснула рукой грудзі і енкнула сьціха.

Была цяпер то бледная, то чырвоная, подых мела карогкі, урываны, погляд неспакойны, пасьпешны...

Былі ужо за грэбляй, у гародах, за трое ганей якіх ад вескі.

Раптам Антось сыкнуу.

— Хацеу я пасьпяшыцца—сказау—але ня йдзе! Надта-ж ужо змучыуся я у дарозе!

Спыніуся і паціpау нагу.

Крыста пераглынула сьліну, бытцам хвіліну сумляваючыся.

Іураз падняла да яго твар пашарэушы, бытцам хто ей попелам дзьмухнуу, і сказала бяззычным голасам:

— Дык ідзі-ж сабе, Антоська, паволі, а я уперад скочу... Мацеры скажу...

— Э... не! Чакай лепш! Пойдзем разам!

— У паумалітвы вярнуся! Памаленьку ідзі! Я у міг скокну.

Адвярнулася і стала хутка ісьці.

— Чакай, Крыся! Ды чакай жа!—крычау Антось.

Але не чакала. Ішла што-раз хутчэй. З пауговяу ужо перайшла, а ен стаяу на месцы і ногу паціpау.

І раптоуна бягом вярнулася і на шыю яму кінулася.

— Дык ты мяне любіш, Антоська?

Хацеу нешта адказаць, але гарачые вусны да яго вуснау прыціснула і праз хвілю на грудзях яго павісла.

Быу нейкі енк у гэтай пяшчоце, нейкі гвалт сьмяртэльны.

А Антось, радасны сьмяяуся.

— А гэткі вярнулася ты да мяне!

Адарвалася ад яго праз сілу.

— Дык ідзі ж цяпер памаленьку—казала,—ды у дзьверы глядзі, а я толькі уляту, мацеры скажу, і зараз вярнуся! Яшчэ да гэтай вярбы ня дойдзеш, як вярнуся Антоська!

Бегла ужо. Апошніе словы расплыліся у паветры імглістым.

* * *

Павал сядзеу на лаве за сталом у новым кажуху у адсунутай на патыліцу шапцы, і грошы, узятые на кірмашы за два валы, лічыу. Побоч з ім сядзела старая Карбавячка, у сьвяточнай адзежы, у яскравых крызах і пацерках. Локці падперла на стале, бараду на руках, і на лічаные грошы пазірала крыху затуманенымі пачастункам у Шымэліхі вачамі.

У кутку, пры коміне, калыхала „Глухая“ дзіця, хціва выдаючы з гаршку полiуку, што асталася ад абеду.

Зьнячэуку ціха адчыніліся дзьверы і убегла Крыста.

Убегла, па хаце глянула і ля ложка стала.

Парабак, які у голас лічыу, заікнууся і змоук.

Старая павярнула голау.

— Крыста!—адазвалася крыху мутным голасам.—А дзе ты гэтулькі часу была?

Не адказала. Вусны мела заціснутые, твар зьбялелы, вочы расшыраные, як дзьве чорные плямы. Скінула хустку, скінула хвартух, шпурнула на падушкі вузельчык з грашыма, зірнула на матку, на дзіця, шкаплер з шыі рванула і праз другіе дзьверы выляцела з хаты.

— Што гэта? Што сталося?—запыталася старая, калі яе вецер, з адчыненых на прастрэл дзьверау, холадам абвеяу.

Парабак вытрашчыу вочы: грошы, што у руках трымау, пакаціліся з звонам па стале.

Крыста бегла. Да рэчкі бегла, як бляск неспадзейны, ціхі. Пераляцела гарод, сенажатку, калі засьвяцілася перад ею вялікая, глыбокая, з глухім гукам бягучая вода, прыжмурыла вочы, сьціснула плечы і, схапіушыся аберуч за голау, моучкі кінулася у глыбіню.

У гэты час Антось у дзьверы хаты уваходзіу.

(*Канец*).

Пераклала **Вясёлка.**

разьбіто, што асталася для яе толькі сямья. І вось гэты „хатні супакой“ і падтрымлівае яе і лучыць яе з жыцьцем. Разваліуся хатні супакой,—парвалася нітка яе жыцьця. Недастатак у абрысоўцы тыпу Марыі той, што аутар занадта коратка затрымауся і бледна вырязіу момант псыхічнага перажываньня яе перад самагубствам. Прауда, яна тып цьверды і рашучы: што скажа, то і зробіць. Але яна усе ж такі—маці і любячая жонка, і разлучацца з сьветам ей ня легка. Дзеле таго самагубство Марыі зьяуляецца нечым неспадзяваным, нечым нязгодным з яе характарам.

Чацьвертая асоба—Матыльда. Матыльда—гэта усымболізованые ідэалы—каханьне Сьцяпана. Матыльда—гэта цень, акружаны арэолам чароунай сымболікі. Бачыш, нібы разумееш,—аднак хочацца разам з Сьцяпанам крыкнуць: „Матыльда! хто ты, і што ты?“

Цень—шарманшчык вельмі удачны. Зьяуляецца на момант, але дае цэльнае, закругленае уражэньне, дае абраз выразны і закончаны.

Што ж можна сказаць аб вартасьці твору „Цені“ у беларускай літэратуры?

Калі-б „Цені“ пералажыць на нямецкую, французкую або польскую мову і калі-б француз, паляк або немец убачыу „Цені“ на сваей сцэне,—то для кожнага з іх гэты твар быу-бы сваім, блізкім і зразумелым, і кожны з іх мог бы палічыць яго уласным.

З другога боку, калі-б 26 сьнежня у зале гарадзкога тэатру быу прысутным інтэлігэнт, але глухі, яму бы і у галаву ня прышло, што ен бачыць арыгінальны беларускі твор.

Дзе ж прычына?—А вось дзе: і нямецкае і французкае і польскае жыцьце ужо стварыло тып Сьцяпана. Ен можа быць і паляком, і немцам, і французам, толькі не беларусам, бо беларускае жыцьце яшчэ Сьцяпана не стварыло.

Літэратура таго, ці іншага народу есьць прадукт культурнага разьвіцьця гэтага народу; літэратура—гэта люстра, у якім адбіваецца матар'яльнае і духоунае жыцьце.

Толькі той твор можа заняць пачеснае мейсцо *у беларускай літэратуры*, у якім будзе адбівацца *беларускае жыцьце*.

Чалавек, наагулі тые адзнакі яго характару, якіе могуць быць у ва усіх людзей, г. зн. агульна чалавечые пачуцьці, вельмі багата і вельмі поуна выяулены у эуропэйскай літэратуры.

Беларус, яго душа, яго жыцьце яшчэ вельмі бледна і нявыразна адбіваюцца у беларускай літэратуры. З шмат бакоу душа беларуса для нас яшчэ пацемкі; з шмат бакоу беларускае жыцьце для нас яшчэ незразумелае.

На гэтым шляху працы яшчэ велізарны непачаты куток: мы мусім высьвіць з усіх бакоу, мусім тонка зразумець беларуса... самых сябе.

І вось, калі Ф. Аляхновіч возьме для свайго твору сюжэт з беларускага жыцьця, і калі у гэтым творы будзе столькі драматычнай сілы, такая прыгожасьць і багацьце мовы, столькі і так прыгожай сымболікі, як у „Цені“,—напэуна такі твор зойме адно з першых месц у беларускай літэратуры.

Дз—і.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЬЦЕ.

У дзень новага году, заутра, усе установы, крамы і магазыны будуць зачынены увесь дзень.

Праваслауное насяленьне сьвяткуе Новы год па старому стылю.

Зьезд прадстаунікоу сыяніцкіх арганізацыяу адчыніуся учора у Менску.

Кандыдаты на пасаду бургомістра пры мястовай радзе пакуль што выстауляюцца два—Э. Амбрашкевіч і Даунар-Запольскі.

Агульны лік закладнікау, якіе у хуткім часе маюць праехаць праз Менск, а так-сама і астацца тут, даходзіць, подлуг афіцыяльных вестак, да 15.000 чал.

Будуць нарыхтованы спэцыяльные цягнікі да 800 чалавек у кожным.

Многіе з мясцовых б. чыноунікау думаюць у хуткім часе выехаць у занятые ахвотніцкімі войсьмамі тэрыторыі б. Расіі. Адтрыманы весткі з Варшаускага расійскага камітэту, што цяпер можна ехаць на поудзень Расіі. Пытаньне аб адпрауцы эшалонамі, зарэгістраваных 2 месяцы таму назад,—пакуль нявыяснено.

Група мясцовых фінансістау адчыняе вялікае экспортна-імпортнае прадпрыемство. Маюць залажыць свой банк, арганізаваць закупку сырцу на мясцох і тавараабмен з заграніцай.

Зьвязь з заграніцай значна наладзілася. Досіць акуратна прыбываюць лісты і газэты з Нямеччыны, Чэхіі, Францыі і Англіі. Апошнім часам прыбывае у Менск шмат лістоу з Амэрыкі.

На почце, у зьвязку з павялічэньнем карэспандэнцый, павялічан штат чыноунікау. Адчынено яшчэ адно акенцо для прыему заказных лістоу. Ня гледзячы на гэта, штадня на почце вялікіе чаргоукі для падачы лістоу прыходзіцца чакаць 2—3 гадзіны.

Рэгістрацыя насяленьня, як мы даведаліся, прадоужыцца да 10-га студня, пасьля чаго усе незарэгістраваные будуць арыштоувацца.

У зьвязку з супакоем на фронце пачауся масавы пераход у савецкую Расію. Глауным чынам пераходзяць спэкулянты з сахарынам, какаінам, керанкамі і савец. грашыма. Пераходзяць так сама на наш бок сяляне па соль. Многіе сяляне, каторых затрымліваюць пры пераходзе, арыштоуваюцца.

Зьмена у расьпісаньні цягнікау на Варшаву і Вільню мае быць 5—10 студня.

Сярод арандатарау зямель. Кантора архірэйскага дому і катэдральнага сабору апавяшчае сьпісак недаімшчыкау—арандатарау для падачы на іх зыску аб зьняцьці дамоу і высяленьні.

Мясцовые коопэратывы арганізуюць з новага году шырокую закупачную работу. Б. Цэнтр. рабочы коопэратыу, а так-сама саюз жыдоускіх коопэратывау, маюць павялічыць паевы узнос і на капіталы рабіць вялікіе закупы тавара у Варшаве і заграніцай. У першую чаргу маюць здабыць прадукты першай патрэбы, павялічыць працу хлебапякарняу, арганізаваць абмен мукі на соль і наладзіць рад новых майстэрняу. Б. Ц. Рабоч. коопэратыу адчыніу папяросную фабрыку.

Саюзам злучаных коопэратывау адчыняецца гэтымі днямі на Катэдральным пляцу для пайшчыкау гэтага раёну новая крама № 13, для прадажы хлеба, солі, газы і інш. Цэны даступные.

Прадажа дроу магістрацкім аддзелам апалу, пасьля некаторага перарыву, пачынаецца зноу з 7-га студня па 800 р. саж.

Тэатр і мастацтво.

27-га сьнежня у клюбе Цэнтрабелсаюзу Т-вам працаунікоу беларуск. мастацтва была зроблена вечарынка.

Спачатку выступіу хор з зьвяздою і прапеу калядные песьні. Абраз быу досіць прыгожы. Потым была пастаулена камэдыя-аднаактоука М. Кудзелькі, у каторай аутар з вялікім гумарам правеу роль дзяншчыка. Я. Сьвятляк у ролі афіцэра быу на сваім месцы. О. Верас у ролі каханкі і Л. Зарніца (пакаеука) іграла жвава. Лапаць дау добрага тыпа жыда мясьніка. Наогул, пьеска прайшла жыва і публіка шчыра рагатала.

Дэклямацыі выйшлі няудачные.

Самае найлепшае уражаньне, як заусёды, зрабіу хор пана Тэраускага. Вечарынка закончылася танцамі.

А. Ц.

Беларускі тэатр.

У пятніцу, 2 студня, у гарадзкім тэатры другі спэктакль Беларускага Тэатру пад дырэкцыяй Аляхновіча. Іграць будуць драму у 3 актах Аляхновіча „Страхі жыцьця“.

Рэдактар-выдавец
Ядв. ЛУЦЭВІЧ.

З дазв. вайсков. цэнзуры № 56. 31/XII. Менск. Друкарня Інвалідау.